Куница очень проворна, ей доступны все уголки леса: легко заберется в птичье или беличье гнездо, исследует завалы упавших стволов. Делает это, разумеется, не из любопытства, а ради пропитания.

Длительное ожидание

Брачный период у куницы проходит в разгар лета, детеныши появляются на свет в конце апреля — начале мая. В теплом уютном дупле у самки рождается 3-4, а иногда даже 8 детенышей. Первое время кунята слепые и беспомощные, у малышей открываются глаза примерно через месяц. С появлением зубов самка начинает приносить потомству мясной корм. До осени семейка держится вместе, а в конце сентября молодые зверьки покидают "родительский дом" и начинают вести самостоятельный образ жизни.

Факторы угрозы

Когда-то человек охотился на лесную куницу ради ее густого, теплого и красивого меха. Шкурки этого животного у древних славян были своеобразной валютой. Мех лесной куницы ценился и в средние века, его носили и дворяне, и горожане. Животных ловили с помощью ловушек и силков. В наши дни серьезной угрозой для существования куницы является вырубка старых лесов — основных мест обитания этого красивого и интересного вида.



Анастасия РЫЖКОВА, младший научный сотрудник ГПУ "Березинский биосферный заповедник"
Фото Дениса ИВКОВИЧА

Голубянка икар
(Polyommatus icarus)

Горошковая белянка
(Leptidea sinapis)

ЮН

Порхающие

ТОП самых красивых бабочек белорусской природы

Эти необыкновенно красивые творения природы во все времена поражали разнообразием красок, причудливыми формами и затейливыми рисунками. Они рождаются для того, чтобы умереть, дав перед этим жизнь новому поколению. Разве не удивительно, что толстая прожорливая гусеница превращаеся в грациозную яркую красавицу?

Чтобы полюбоваться на бабочек, не нужно ехать в другие страны: в Беларуси тоже есть свои живые цветы. Давайте просто смотреть и любоваться.

Луговая сенница
(Coenonympha oedippus)

Дневной павлиний глаз
(Inachis io)

Малинница
(Callophrys rubi)

Махаон
(Papilio machaon)

Мнемозина,
или черный апполон
(Parnassius mnemosyne)

ЮН

цветы



Ракитниковая желтушка,
или желтушка мирмидона
(Colias myrmidone)

Интересные факты о бабочках

- Чтобы летать, бабочкам необходимо солнечное тепло.
- Бабочки никогда не спят.
- Глаза этих насекомых состоят из 6 тысяч крошечных линз.
- Вкусовые рецепторы у бабочек находятся на лапках, т.е., стоя на растении, они могут ощутить его вкус.
- Питаются бабочки нектаром и другими растительными выделениями, содержащими сахар. Однако некоторые виды никогда не едят, так как не имеют рта. Они живут на энергии, которую накопили в виде гусениц.
- В русском языке слово “бабочка” является производным от слова “баба”. Наши предки считали, что все ведьмы после смерти становятся бабочками.
- Бабочки близоруки.
- Некоторые бабочки общаются друг с другом с помощью звука, большинство бабочек-самок выпускают феромоны в воздух.



Толстоголовка фавн
(Ochlodes sylvanus)



Перламутровка эвфросина
(Clossiana euphrosyne)

Фото Анатолия ДРИБАСА,
Анатолия КУЛАКА,
Александра РАКОВИЧА

Віншуем нашага даўняга і актыўнага аўтара Генадзя Аўласенку з 60-гадовым юбілеем! Жадаем яму здароўя, шчасця і творчага плёну.

СПРАЎЛЯЎ КАРАСЬ ІМЯНІНЫ

Спраўляў карась імяніны, купіў карась пуд мякіны і напёк з яе бліноў для сваіх гасцей ліноў:

— Ліны-ягамосці! Запрашаю ў госці! На мае ймяніны, на бліны з мякіны!

Адказалі ліны:

— Сам каштуй свае бліны! Хто ж пячэ бліны з мякіны, ды яшчэ на імяніны?

Сказаў карась:

— Вінаваты!

Паплыў карась хутка з хаты. Ад хаты — да брамы, ад брамы — да крамы. Там купіў мукі і грэчкі, распаліў у рэчцы печку. Шчыраваў да ранку, напёк абаранкаў, бублікаў, піражных, піражкоў тварожных, варэннікаў з макам, іншых прысмакаў...



Зноў па рэчцы плыве, зноў сяброў-ліноў заве:

— Ліны-ягамосьці! Калі ласка ў госці! У хату-хаціну з балотнае ціны, на маё на свята, ды на стол багаты!

Ліны ў госці прыплывалі, усе стравы спрабавалі.

Самі спрабавалі, дзетак частавалі.

Віншавалі карася...

Тут і казка мая ўся!

Генадзь АЎЛАСЕНКА

КАЗКА

Шубуршун

Рэкі, праз якія пралёг маршрут вандраванняў Шубуршуна, станавіліся для маленькага падарожніка сапраўднай школай. Трапіўшы ноччу пасля ўцёкаў з утульнай гарадской кватэры ў Свіслач, наш юны герой ішоў шляхам адкрыццяў і выпрабаванняў. Так, шмат чаго Шубуршун не ведаў...

Адважны вандроўнік, які смела кінуўся ў ваду, адразу і думаць не думаў, і гадаць не спрабаваў, якім павінен быць яго шлях. Варта было толькі адной з хваль павярнуць карабель у іншы бок — і Шубуршун мог аказацца ў Пярэспе ці Нямізе. Альбо яго лодку вецер мог занесці ў Лошыцу ці Сляпянку. Мала цікавага было б з такога развіцця падзей. Так і застаўся б Шубуршун у адным з прытокаў Свіслачы, сярод таго бруду, што збіраўся тут з гарадскіх вуліц. І галоўным шчасцем для яго быў бы дождж, які звычайна прыўносіў у гэтыя маленькія рачулкі чысціню і свежасць.

На шчасце, свіслацкія хвалі спрыялі развіццю, прадаўжэнню няхай сабе і няпростага маршруту. А за Свіслаччу была Бярэзіна. З дня ў дзень рачны капітан толькі і паспяваў па баках азірацца, настолькі шмат новага адкрывала яму падарожжа.

Усім сваім нутром Шубуршун адчуваў, што наперадзе яго чакаюць яшчэ шырэйшыя рэкі. Яшчэ больш высокімі будуць іх хвалі. Так здарылася і з Дняпром. Сустрэча з гэтым магутным асілкам адбылася надвячоркам. Гадзінадругая — і ўжо згубілася б за даляглядамі сонейка. І хто ведае, ці змаглі б адважныя вандроўнікі не згубіцца ў начы. Не раз сутыкнуўшыся і на Свіслачы, і на Бярэзіне з наравістымі, свавольнымі хвалямі, Шубуршун разумеў, што на вадзе многае залежыць не толькі і далёка не ад уласных жаданняў, памкненняў. Вада — такая магутная сіла, што пад яе трэба падладжвацца, з ёю трэба сябраваць. Іншым разам і пярэчыць ёй ніяк нельга. Гэта не значыць, што трэба адмаўляцца ад свайго выбару. Варта толькі ўзважваць свае сілы і думаць пра тое, ці хопіць іх, каб прайсці тым ці іншым шляхам.

Сілу, магутнасць Дняпра Шубуршун адчуў адразу, як толькі бярэзінскія хвалі падштурхнулі малюсенькі карабель-трэсачку да новай рачной прасторы. Дакладней —



трапляе ў Днепр

не падштурхнулі, а літаральна мякка перанеслі, перадалі з адных на другія плечы. І зрабіла гэта адна Хваля Свавольніца. Калі б яна напрыканцы не загаварыла з капітанам, то ізноў жа многага Шубуршун і не ведаў бы.

— Капітан, ты пакідаеш Бярэзіну, — зашапацела Хваля Свавольніца, — праз некаторы час ужо нашы дняпроўскія сяброўкі возьмуць цябе пад сваё крыло. Не бойся, ніякай бяды яны табе не зробяць. Паводзь сябе спакойна, ніякія трывогі не павінны цябе страшыць.

— Ды я не баюся, — сумеўся Шубуршун. Колькі ён ні плыў па Бярэзіне, а вось такая размова адбываецца ў яго ўпершыню.

Так, зусім нядаўна адна з імклівых хваль выратавала капітану і ўсяму экіпажу лодкі жыцці. Шубуршун нават як след і не падзякаваў. Мо яшчэ лёс звядзе з той памагатай, якую інача, як па імені Спадарыня Хваля, вандроўны капітан і не ведаў. Але ж тут гаворка ішла пра Днепр...

— І ўсё ж мне крышачку трывожна, — прызнаўся Шубуршун. — Днепр — дужа вялікая рака...

— Павер мне, капітан, — зашапацела Хваля Свавольніца, — Днепр, хаця і вялікая і магутная рака, усё адно жыве тымі ж клопатамі, што Бярэзіна, Свіслач, ды і іншыя нашмат меншыя рэкі... Вада не служыць сама сабе. Яна — руплівы працаўнік і памагаты. Ты ж бачыў, колькі тут, у Бярэзіне, рыб плавае. Як ім без вады абысціся?!. І ў Бярэзіне іх столькі ж, колькі і ў тваёй любімай Свіслачы. У Дняпры яшчэ болей. А яшчэ вада сілкуе энергіяй механізмы, абсталяванне электрычных станцый. Тыя з іх, што месцяцца на вадзе, на рэках, называюцца гідраэлектрастанцыямі. Рэкі, хвалі нясуць на сваіх плячах караблі і лодкі, дапамагаюць людзям пераязджаць, перавозіць цяжкія грузы. Ды што тут казаць, як чалавеку не абысціся без крывяносных артэрый, так Зямлі не абысціся без водных шляхоў, без рэк, без вады, што вандруе з месца на месца. І Днепр — таксама вялікі, спагадлівы і чулы вандроўнік. І павер, дарагі капітан, ён будзе добрым тваім памагатым і праважатым. А я развітваюся з табою...

Хваля развярнулася вакол лодкі-трэсачкі, якую пры гэтым крыху падкінула ўгору. Не паспеў капітан нічога сказаць, як яго карабель падхапіла новая хваля і панесла наперад яшчэ хутчэй.

— Вось і Днепр нас сустракае, — вымавіў Шубуршун. — Родная рака для мурашоў-чужынцаў, з якімі мне, відаць, хутка давядзецца развітвацца...

Вочкі малечы заблішчалі. Сум апанаваў вандроўнага капітана. Праўда, сум светлы і добры. "Павінны ж мурашы вяртацца да свайго жыцця на радзіме", — падумаў Шубуршун і пачаў вачыма выбіраць месцейка, дзе яму можна было б заснуць, адпачыць колькі гадзін. Карабель ідзе роўна — перажываць за яго правільны курс не трэба. А заўтра з самага світання яму, капітану, адкрываць і адкрываць новую і дагэтуль невядомую дняпроўскую прастору.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

ЮН

БАТАНІЧНЫ САД



Ідзём паміж прысад,
Зважаючы на краскі,
У Батанічны сад,
Што акурат
Як райскі.
Аздобілі траву
Суквецці на паляне.
Здаецца,
Што плыву
У кветак акіяне.
Нібыта маякі,
Палаюць вабна клумбы.
Мы тут — як маракі,
Дакладней —
Як калумбы.
Звініць шчаслівы крык:
Відаць, хлапчук сталічны,
Нібыта мацярык,
Адкрыў —
Сад Батанічны.

Уладзімір МАЗГО

ПОЎНАЯ ЖМЕНЬКА



Жыта налілося,
Кажа Сеньку тата:
— Палічы, ці многа
Ў каласку зярнятак.
У руцэ расцерлі
Каласок шурпаты.
Як зярняткі толькі
Палічыць без таты?
Ён яшчэ маленькі,
Ды знайшоўся Сенька:
— Во, зярнятак многа —
Поўненькая жменька!

Мікола МАЛЯЎКА

Вядучы старонкі Уладзімір МАЗГО. Малюнкі Алега ПАПОВА

Умовы віктарыны — у 1-м нумары "ЮН"

Па старонках "Роднай прыроды"

ВОСЬМЫ ТУР

1) "Зямлёй перцу", ці радзімай чорнага перцу, называюць:
А) Балгарыю
Б) Узбярэжжа Малабар у Індыі
В) Цэнтральную Амерыку

2) Які пчаляр першым прапанаваў разборны рамачны вулей:
А) Пётр Пракаповіч
Б) Шарль Дадан
В) Лорэнц Лангстрот

3) Апошнія прадстаўнікі каўказскай лініі зуброў зніклі ў...
А) 1912 годзе
Б) 1921 годзе
В) 1927 годзе

4) У якой краіне знаходзіцца містычная лагчына чорнага бамбука?
А) У Кітаі
Б) У Японіі
В) У Паўднёвай Карэі

5) Адзначце, якія два віды птушак сёлета пакінулі спіс беларускай арнітафаўны:
А) Індыйская горная гусь, пласканосы плывунчык
Б) Белабрухі стрыж, чайканосая крачка
В) Барадатая курапатка, кукша

6) Які малюск выкарыстоўваецца для ацэнкі забруджвання адтокаў камунальнай звалкі?
А) Пярловіца звычайная
Б) Дрэйсена рачная
В) Шароўка балотная

7) Калі адзначаецца Міжнародны дзень беспрытульных жывёл?
А) 10 жніўня
Б) 20 жніўня
В) 16 жніўня

8) Вёска с касмічнай назвай Марс знаходзіцца ў...
А) Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці
Б) Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці
В) Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці

9) Якая ахоўваемая прыродная тэрыторыя знаходзіцца на месцы былога "мора Герадота"?
А) Гідралагічны заказнік "Гайна-Бродня"
Б) Нацыянальны парк "Прыпяцкі"
В) Рэспубліканскі ландшафтны заказнік "Налібоцкі"

10) Вызначце від птушкі.


Фота Мікалая ГУЛІНСКАГА

Адказы на пытанні віктарыны прымаюцца да 20 верасня.

Дасылайце адказы на e-mail: pryroda@zviazda.by, а таксама на паштовы адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Адказы на пытанні сёмага тура віктарыны:

1) 12–20 тысяч
2) Дзіванна
3) Эфіопія
4) 6–10 км
5) Максімальнае выкарыстанне другасных матэрыяльных рэсурсаў
6) 3 сакавіка
7) Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці
8) Паўднёвая Амерыка
9) Выдра
10) Буры мядзведзь

Над выпускам працавалі Вераніка КОЛАСАВА і Кацярына РАДЗЮК

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА



“Добры дзень, вадзіцы-крыніцы!”

або Цудадзейная вада ў традыцыйных уяўленнях беларусаў

Уяўленні пра цудадзейнасць вады ўзніклі ў свядомасці нашых продкаў, верагодна, дзякуючы яе прыродным якасцям: свежасці, празрыстасці, здольнасці ачышчаць чалавека як у фізічным, так і энергетычным планах. Існуе вялікая колькасць паданняў і легенд пра “жывую” і “мёртвую” ваду. Адна з іх дапамагае чалавеку набрацца моцы і лёгка адужаць свайго праціўніка, другая здольна пазбавіць яго геройскіх якасцей: “Як напіўся валшэбнай вады, Кацігарошка паслышаў у сабе яшчэ болей сілы і за хітрасць хацеў было змея забіць. Падашлі ізнову к мерцвяцам, перва брызнулі на іх жывой вадой — яны сталі, слоўна як жывыя, толькі дыхання ў іх нетуці. Як брызнулі на мерцвяцоў із другой бутылі — брацця ажылі”.

Месца “выхаду” вады на паверхню зямлі

Стаўленне да вады цалкам абапіралася на цэласную карціну свету, на ўсю складаную сістэму светапоглядных уяўленняў. Статус вады, яе характарыстыкі і, адпаведна, адносіны чалавека да яе прадвызначаліся месцам яе знаходжання і той славай або знясlаўем, якія за ім замацаваліся.

Шматлікія помнікі пісьменнасці сведчаць, што старажытныя славяне з асаблівай пачцівасцю ставіліся да крыніц — месца самастойнага выхаду вады на паверхню зямлі. Месца, дзе пачынала “звінець” вада, ачышчалі ад смецця і буралому, ставілі невялічкія агароджы, маркіравалі апазнавальнымі знакамі. Пазней такім знакам стаў крыж, на які павязвалі ручнік, гэта станавілася месцам маленняў, сустрэч, выканання рытуальных дзеянняў. Каб здзейснілася пажаданне або знікла хвароба, вадзе прыносілі ахвяру — манету або іншыя рэчы; у некаторых выпадках на галінкі дрэва каля крыніцы прымацоўвалі невялічкі кавалак тканіны або пояс. Да крыніцы прыходзілі маладыя, каб прамовіць малітву вернасці, каб заручыцца падтрымкай святога месца, каб іх сумеснае жыццё было такім жа светлым, чыстым, як крынічная вада. Сюды прыносілі немаўлятка, каб далучыць яго да жыццёвай ручаіны роду. І хаця найчасцей за ўсё крыніцы з’яўляліся ў самых непраходных, аддаленых месцах, але адразу ж яны станавіліся святыняй мясцовасці.



Асаблівай пашанай у народным асяроддзі карысталіся яўленыя іконы, а таксама мясціны (дрэва, бераг ракі, крыніца, узгорак), дзе яны былі знойдзены. Як правіла, у тых месцах будавалі капліцы і нават храмы, як, напрыклад, у в. Жыровіцы Слонімскага раёна. Там жа, недалёка адзін ад аднаго, б’юць тры ключы, вада ў якіх лічыцца цудадзейнай. Вобраз Багародзіцы або якіх-небудзь святых, адлюстраваных на яўленых іконах, становіцца апекуном дадзенай мясцовасці.

Каб прыйсці да вады, трэба ведаць “найлепшы” час

У стаўленні чалавека да вады дзіўным чынам увасаблялася філасофская праблема суаднесенасці прасторы (месца знаходжання) і часу (таго незвычайнага моманту ў каляндарным коласвароце), якія надзялілі ваду незвычайнымі якасцямі. На перасячэнні гэтых каардынат, пазначаных статусам сакральнасці, і “ўзнікала” тая незвычайная вада, якую ў народзе ахрысцілі “жывой”. Этнографы пачатку ХХ ст. пісалі: “Вясной, пасля першага грому, пачынаюць людзі ісці да крыніц памыцца і памаліцца, ідуць у вядомыя дні, здаўна ўстаноўленыя: на Юр’я, на Міколу, на Ушэсце, на Дзявятніка, на Дзясятніка, на “русальнай нядзелі” (першая пасля Тройцы)”.

Акрамя гэтага, на працягу года было яшчэ некалькі “асаблівых” дзён, калі бралі ваду з крыніц: раніцай на Раство Хрыстова, яе называлі “святочнай”; раніцай у дзень святкавання Стрэчання, або Грамніц (“срацэнская” вада); абавязкова клапаціліся аб вадзе, якая набірала цудадзейную моц у ноч з серады на Чысты чацвер (дні Страснога тыдня) — ваду ў вёдрах ці іншых ёмістасцях ставілі пад “адкрытыя” нябёсы на ўсю ноч; незвычайнымі якасцямі валодала “купальская” вада.

Асаблівыя адносіны былі да вады, якую бралі ў дні вялікіх каляндарных ці царкоўных святаў раніцай, на ўзыходзе сонца. Пры гэтым той, хто прыходзіў па ваду першым, станавіўся ўладальнікам самай цудадзейнай вады — “непачатай”.



Выкарыстанне цудадзейнай вады пасля выканання рытуальных дзеянняў

Акрамя таго, што на працягу года было шмат дзён, якія надзялялі ваду цудадзейнымі здольнасцямі, нашы продкі заўважылі, што незвычайнай, энергетычна станоўчай, гаючай, “жывой” вада станавілася пасля некаторых рытуальных дзеянняў.

- “Чарадзейнай” лічылі ваду, якая засталася пасля гатавання яек на Вялікдзень, ёй даволі паспяхова лічылі скурныя захворванні.
- Ваду пасля абмывання царкоўнага звона, іконы, хлебнай дзяжы выкарыстоўвалі для лячэння цэлага шэрагу захворванняў энергетычнага кшталту (сурокаў, рожы, спуду і г.д.).
- Вадой, у якую клалі дзевяць пупышак асвечанай вярбы, мылі хворых дзяцей.
- У народнай медыцыне шырока выкарыстоўваўся прыём пералівання вады праз розныя адтуліны: клямкі, завесы, у смаліне, праз заручальны пярсцёнак, а таксама праз рэшата. Лічылася, што так вада набывала незвычайныя здольнасці, яна мяняла сваю структуру і спрыяла лячэнню пярэпалахаў, як дзіцячых, так і дарослых.

● Даволі часта, каб пазбавіцца хваробы, знахары прасілі людзей... прынесці з крыніцы дадому ваду ў роце.

● Незвычайнай лічылі ваду, узятую там, дзе зліваюцца дзве, а яшчэ лепш — тры ручаіны. На Юр'я, калі рыхтаваліся да першага выгану жывёлу на пашу, на самым досвітку гаспадар браў вядро і спяшаўся да гэтага месца. Па цячэнні ён зачэрпваў вядро вады, якой потым гаспадыня абмывала вымя кароўкі, каб яна была "малочная, а не ўрочная". Такую ж ваду выкарыстоўвалі для лячэння жанчын, якія раптоўна "гублялі" малако.

● Асаблівай павагай карысталася вада, набраная з трох (сямі, дзевяці або дванаццаці) калодзежаў ці ручаін. Добра вядома, што вясельны каравай сімвалізаваў родавую паяднанасць, прычым гэтая знітаванасць прасочвалася ў двух планах. З аднаго боку, самыя паважаныя, самыя блізкія сваякі знасілі на адзін стол муку, соль, цукар, яйкі і ваду ў цэнтр стварэння сусвету — у хату, у якой закладваўся падмурак будучыні роду, а жанчыны-каравайніцы спявалі:

Звязлі, зняслі
Сем бочак мукі на каравай.
Звязлі, зняслі
Сем фасак масла на каравай.
Звязлі, зняслі
Сем пудоў цукру на каравай.
А Божа мой,
Вялік, высок наш каравай.

***

Каб я знала, каб я ведала,
Да што ў тваім караваі
Да тры вядры крынічнай вадзіцы,
Да тры пуды пшанічнай мучыцы,
Да тры фаскі дравічнага масла,
Да тры капы перапяліных яек,
Да два фунты заграпічнае солі.

Удакладнім, што "тры вядры крынічнай вадзіцы" з песні былі ўзяты з трох розных калодзежаў або розных крыніц. З другога боку, уся гэтая ідылічная карціна малявалася для таго, каб "перадаць спор" (нарадзіць дзетак, паспрыяць ураджайнасці, плоднасці статку) наваствoранай сям'і і перадаць родавую эстафету і надалей. Вада і мука, знесеныя для прыгатавання каравая, былі не чым іншым, як першымі стыхіямі, з якіх утварыўся свет.

● Шыкоўны прыклад таго, як вада і цеста ў сумесным спалучэнні станавіліся прадказальнікамі долі дзіцяці, знаходзім у зборніку беларускіх замоў: "Калі дзіця захварэе на сухоты, трэба расчыніць хлеб, зрабіць пальцамі пасярод дзяжы глыбокую ямку ў цесце, наліўшы ў яе поўна вады, накрыць дзежку векам. Калі ўжо цеста добра падыдзе і прыйдзе пара садзіць яго ў печ, тады, адкрыўшы века, паглядзець, ці ёсць у гэтай ямцы вада, ці няма. Калі вада ўвабралася ў цеста, гэта бясспрэчнае сведчанне таго, што ніякія чары не дапамогуць, бо дзіцяці наканавана памерці. У адваротным выпадку маці хворага дзіцяці кліча дзвюх зычлівых да сябе нявестак і робіць такім чынам: адна выкладае на лапату лісце, другая трымае дзіця на руцэ, а калі ўсё лісце пакладзена, садзяць яго на лапату; у гэты час трэцяя зачэрпвае далонню ваду з той ямкі і абмывае дзіця з ног да галавы. Падчас гэтага абмывання паміж тымі жанчынамі завязваецца наступны дыялог:

— Што ты змываеш? — гаворыць тая, што клала лісце.

— Сухоты! — адказвае тая, што змывала.

— Змывай, змывай, каб не было ніколі!

Потым адна бярэ дзіця і нясе яго нібы на падворак, але, як стане з ім у дзвярах, тады першая пытаецца ў яе:

— Што ты выкідаеш?

— Сухоты!

— Выкідай, выкідай, каб не было ніколі.

● Лічылася, што цудадзейную моц вады павялічвалі прадметы, апушчаныя ў яе (манеты, зерне, крыж) і словы (малітвы, замовы), прамоўленыя над посудам з вадой.

● Калі побач з пасекай працякаў ручай або была крыніца ці калодзеж, то вада ў іх таксама лічылася гаючай. У народзе лічылі, што там, дзе жыве "Божая памочніца" — пчала — вада станавілася няпростай. Над такой крыніцай звычайна ставілі капліцу з абразам Салавецкіх святых Зосіма і Савацыя.

Выкарыстанне вады ў рытуальных дзеяннях, скіраваных на "павелічэнне", "прыбаўку", "поспех"

Найчасцей за ўсё ў магічных рытуальных дзеяннях, якія павінны былі выклікаць прыбытак, павелічэнне, выкарыстоўвалі ваду, імкнучыся перадаць яе рухавасць, аб'ёмы, чысціню і іншыя якасці.

● Так, жанчыну, якая нарадзіла, аблівалі вадой, што бралі з ручая, каб у яе малако пацякло (прыбывала), "як вада".

● Перад тым, як паставіць новы вулей, гаспадар на ноч ставіў посуд з вадой на мяркуемае месца. Калі за ноч вада прыбывала або заставалася на тым жа ўзроўні, гэта лічылі спрыяльным знакам, калі ж колькасць вады змяншалася — дрэннай прыкметай. У такім разе выбіралі новае месца.

● Ваду для асвячэння асобных вулляў ці яго пчальніка імкнуліся браць з "сямі іярдан" — з сямі асвечаных крыніц ці калодзежаў.

● Каб стаць добрым паляўнічым, раілі ваду ўзяць з трох калодзежаў, частку яе выліць налева ад сябе, а астатняй прамыць стрэльбу, ціха прамаўляючы: "Гром б'е, бліскавіца паліць, Святы Пётр свінец правіць".

● Каб стрэльба біла звера напавал, яе абмывалі вадой, якой мылі нябожчыка.

Аксана КАТОВІЧ
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА



Времени вопреки

Время все меняет вокруг, и только одно неизменно: человек остается всего лишь частью природы


“Яблоки”


“Летний сон”

Не потому ли для своих концептуальных полотен художник Олег Костюченко выбирает природные объекты? Например яблоки, как в триптихе “Сегмент времени”. Яблоко в спирали времени как некий запретный плод из райского сада. Яблоко, которое уже успел вкусить человек, жаждущий познания природы и самого себя. И вновь спираль времени с яблоком, и вершина познания в лице смеющегося и показывающего язык Эйнштейна — в мире, и правда, все относительно.

В мастерской, где и другое его философское полотно “Оберег” тоже венчает совсем “яблочный” круг, мы говорим о концептуализме молодого художника как идеализированном видении действительности (от слова “идея”). О его идее самовыражения в простых вещах, так понравившейся ему у Ван Гога. Об остроте видения и четкой грани отбора. И в этом контексте о том, что каждый, задавая себе вопрос “кто я?”, должен искать свое “яблоко”.


Но почему именно яблоко? “Оно и зарождение жизни, — говорит художник, — и совершенная форма, и в нем есть семечки — зерна”.


“Живопись Олега Костюченко довольно аскетична и порой лишена эстетического гурманства, которое предполагает быть в живописи, — считает искусствовед Николай Пограновский. — Но это не снижает общей философской интонации картин. Скорее, наоборот, усиливает присутствие двух полюсов: чувство гротеска и драмы, что помогает более глубоко понять смысл произведения”. И далее: “...Простые истины приходят на смену сложным парадоксальным коллизиям, что, в общем-то, не исключает и новые подтексты, точнее говоря, новые прочтения уже, казалось бы, известных истин, которые становятся частью личного опыта художника”. Эти известные истины о том, что природа — венец всего и что человек — лишь часть ее, что “выше природы не прыгнешь”, что художнику именно природа дает все: свет, цвет, движение, настроение... Дает переживания, которые мастер, говоря современным компьютерным языком, воплощает на внешнем носителе и передает его другим.

Выпускник отделения монументальной живописи Белорусской государственной академии искусств, член Белорусского союза художников Олег Костюченко — участник многих республиканских и международных выставок. Его концептуальная живопись, по словам специалистов, не всегда вписывается в общепринятые нормы. Но именно из “ненормы”, и тому немало подтверждений в истории, рождаются великие научные открытия, шедевры литературы, музыки, живописи.

Лидия ПЕРЕСЫПКИНА

“Сегмент времени”







В поисках торфяниковой желтушки

На пике лета в окрестностях верховых болот, где растет голубика, из коконов появляются очень редкие в наших местах бабочки — торфяниковые желтушки. Их гусеницы питаются листьями этой ягоды.

В поисках желтушки я отправился в лес. Пройдя метров триста в сторону дороги, нашел полянку с разными цветами и насекомыми и стал фотографировать. Здесь мне повстречались желтые стрекозы, которых не было в моем фотоархиве.

Через некоторое время заметил крупную бабочку лесную перламутровку (пафию) и сделал ее снимок, но, увы, неудачный. Где же летает моя бабочка?

Направился вдоль канавы к большому песчаному бугру. И не зря. Остановившись возле орехового куста, увидел под ним незнакомые мелкие желтые цветочки. А на одном из них сидела и вкушала нектар бабочка-невидимка торфяниковая желтушка! Моей радости не было конца!

Вечером позвонил друг Сергей, “охотившийся” на ястреба-перепелятника в Государственном ландшафтном заказнике "Озеры". Он с удовольствием поведал, как снимал редкие моменты из жизни хищных птиц, ведь найти их гнездо не так-то просто. Через два дня в его укрытие засел и я. Мне пришлось подождать часа полтора самку-хищницу с добычей,






пойманной отцом семейства. Птенцы дружно открывали свои клювы, и пернатая мама едва успевала отрывать кусочки мяса от добычи. Это напоминало “кучу малу” в детской игре.

Когда птенцы насытились, они сразу успокоились и заснули. Только после этого я спустился с сосны. Несмотря на ветер и сутолоку в гнезде, пару снимков пернатого семейства мне сделать удалось.

Георгий ГУЛЕВСКИЙ
Фото автора



Зеленые целители почек


Ортосифон тычиночный



Почки у человека — это органический фильтр, очищающий кровь. Парный орган выделяет из организма конечные продукты обмена веществ, избыток солей, воды, чужеродные и токсические вещества. Заболевание почек может возникнуть при сахарном диабете, аденоме предстательной железы, мочекаменной болезни, алкоголизме, а также при гепатите В, туберкулезе и других видах инфекционных заболеваний.


Эрва шерстистая

Часто болезнь вызывают кишечная палочка, вульгарный протей, стафилококк, энтерококк, синегнойная палочка, а также системная красная волчанка, ревматический артрит и т.д.

Развитию болезни способствует переохлаждение, высокая влажность, травмы, физические нагрузки, хронический гломерулонефрит, пиелонефрит, опухоль почки или других органов мочеполовой системы, васкулит, сепсис и др.

Болезнь сопровождается общей слабостью, ноющей болью в поясничной области, учащенным мочеиспусканием, бледностью кожи, повышенными температурой тела и артериальным давлением, болезненностью при поколачивании поясничной области.

Остановимся на самом распространенном диагнозе — нефрите.

В народной медицине считается, что для оздоровления почек необходимо использовать растения, обладающие в основном бактерицидными, противовоспалительными, мочегонными, общеукрепляющими свойствами.

В пищу желательно употреблять: овсяную кашу, кабачки, тыкву, арбуз, петрушку, пастернак, капусту, калину, рябину красную, смородину, сныть, укроп, землянику, яблоки. Не рекомендуется: пиво, копчености, маринованные или консервированные продукты, острые блюда, приправы (лук, горчица, хрен, перец).

В мире растений существует много трав, используемых для оздоровления наших почек. К таковым относятся: аир, брусника, вероника, голубика, дрема, зимолюбка, лопух, лен, овес (молочной спелости), репешок, спорыш, толокнянка, череда и многие другие. Их можно смешивать по 3-7 видов в одном сборе, заваривать и пить как чай без сахара малыми порциями.

Очень полезными считаются такие южные растения, как пол-пала (трава эрвы шерстистой) и ортосифон тычиночный (лист из кустарника, называемого почечный чай). Вытяжки этих растений не вызывают побочных явлений даже при длительном применении.

Из местных растений наилучшими в данном случае считаются в народной медицине все виды плаунов, ситник болотный, спорыш (горец птичий). Они содержат много кремния, столь необходимого для наших почек и надпочечников. Без него плохо усваиваются многие химические элементы, очень важные для нашего организма.

Хорошо помогает лечению почек сбор трав, составленный потомственным терапевтом, автором книги "Лечение растениями" (Москва, 1972 г.) Ниной Ковалевой.

Надо взять по 10 г травы лаванды, листьев смородины черной, листьев березы, травы будры, плодов можжевельника, шишек хмеля, лепестков роз; по 20 г листьев толокнянки, травы буквицы, листьев брусники, листьев подорожника; 30 г травы крапивы; 40 г плодов шиповника; по 60 г плодов земляники, побегов хвоща полевого. Весь набор перемешать, 5-6 г смеси залить 500 г кипятка, томить 30 мин. Настой принимать по 150 мл 3 раза в день за 30 мин до еды теплым.

Желаю всем хорошего здоровья!

Лидия НОВИЧИХИНА,
травовед-целитель

Продовольственная комиссия ООН признала амарант культурой XXI века. Это уникальное растение нормализует все биохимические процессы в организме

Человечество спасет... сорняк

Удивительные свойства амаранту (в переводе с греческого “неувядающий цветок”) приписывали с незапамятных времен. В древней славянской медицине амарант известен больше как сорная трава щирица, ее использовали в качестве средства против старения.

Амарант называют “хлебом инков”, и не зря. Более 6000 лет до нашей эры он был одной из основных зерновых культур индейцев Южной Америки и территории современной Мексики. В Европу семена амаранта завезли в XVI веке испанцы-конкистадоры, его высаживали в оранжереях и палисадниках как декоративное растение.

Второе рождение амарант получил в наше время. Продовольственная комиссия ООН признала амарант основной продовольственной культурой XXI века, которая поможет... спасти человечество. Оказалось, что это уникальное растение нормализует все биохимические процессы в организме. Его семена богаты белком с высоким содержанием лизина, которого нет в других зерновых растениях. Они также содержат витамины группы В, РР, С, Е, богаты кальцием, калием, магнием, фосфором, железом, цинком.

Углеводород сквален, содержащийся в амаранте, предотвращает нехватку кислорода в организме, омолаживает клетки. Он повышает иммунитет, тем самым обеспечивая устойчивость организма к различным заболеваниям, сдерживает рост и развитие злокачественных образований.

Амарант легко выращивать, он не предъявляет особых требований к почвам, любит влагу, но расходует ее очень экономно, способен переносить экстремальные погодные условия и при этом вырастать до 3 м в высоту.

В сельском хозяйстве листья амаранта используют на корм животным. Полезен он и для человека: помогает компенсировать все недостатки рациона. Его можно употреблять детям, взрослым, а также беременным. Он входит в основу многих безглютеновых диет. Единственный “недостаток” амаранта — высокая калорийность.



Нежные листочки молодых растений используют в салатах, из них готовят настои, отвары, компрессы при радикулитах.

По своей питательности и оздоровительному эффекту каши из амарантовой крупы превосходят многие злаковые каши, в том числе и гречневую.

Евгений ШМЕРКО,
врач-фитотерапевт

Каша амарантовая

1 ст. муки амарантовой грубого помола или крупчатки, 2 ст. воды, соль, сахар, сливочное или растительное масло.

Поставить воду на небольшой огонь. Всыпать тонкой струйкой муку, постоянно помешивая. Довести до кипения. Варить 8-10 минут. Соль, сахар и масло добавлять по вкусу.





Хлеб амарантово-овсяный

2 ст. овсяно-амарантовой смеси, 2 ст. кипяченной воды, 2 ч. ложки соли, 0,25 ст. сахара, 1 упаковка сухих дрожжей, 0,25 ст. теплой воды, 4-4,5 ст. пшеничной муки.

Растворить сахар в горячей воде, размешать в ней овсяно-амарантовую смесь, оставить остывать. Развести дрожжи в теплой воде. Смешать в большой кастрюле дрожжи и полученную мучную смесь. Вымешивать до получения однородной массы, постепенно добавляя пшеничную муку, пока тесто не перестанет прилипать к рукам. Разделить его и сформировать два батона. Противень смазать маслом, выложить хлеб. Дважды дать подняться. Выпекать 50-60 минут при температуре 200°С.

БА

Духмяны чай у кляштарным стылі





Класны пакой на прыродзе

"Аптэкарскі сад" — дзіця кампаніі "БелАсептыка". Ідэя яго стварэння нарадзілася ў гэтай фірмы. Праект пачалі рэалізоўваць у 2010 годзе, калі на 35 гектарах былі закладзены першыя палі для вырошчвання лекавых раслін, а таксама пабудаваны памяшканні для першаснай сушкі сыравіны.

— Кампанія прыйшла менавіта ў Мядзельскі раён, таму што ён экалагічна чысты, пазбаўлены буйной вытворчасці, — падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара ААТ "БелАсептыка" Аляксандр Рогач.** — Зразумела, што лекавыя травы павінны вырошчвацца там, дзе добрая экалогія, і абавязкова без выкарыстання хімічных угнаенняў і пестыцыдаў. Наваколле возера Белае — частка тэрыторыі нацыянальнага парка "Нарачанскі" — менавіта тое месца, якое ідэальна падыходзіць для гэтых мэт.



Берагі возера ўяўляюць з сябе рознакаляровае царства траў, ад якіх цяжка адвесці вочы. Жыхары Беларусі, госці могуць не толькі палюбавацца гэтым разнатраўем, але і азнаёміцца са знешнім выглядам зёлак, іх уласцівасцямі. Упэўнена, не многія з нас ведаюць, як выглядае лакрычнік, корань якога з'яўляецца выдатным сродкам ад кашлю, скрыпень, што паляпшае работу сэрца. Словам, калекцыя гаючых раслін даволі вялікая, і сёння яна ўключае ў сябе больш за

200 відаў: валяр’ян, сардэчнік, крываўнік, шалфей, лаванда, некалькі відаў мяты, лекавыя кусты, ягаднікі (журавіны, чарніцы, ажыны, маліны). Пасаджана цэлая алея рабіны. Тут распаўсюджаны і расліны, характэрныя для дзікай прыроды, якія немагчыма знайсці ў Беларусі. Яны прывезены з розных рэгіёнаў свету: Амерыкі, Сібіры, горных масіваў, напрыклад з Альпаў, і адаптаваны да мясцовага клімату.

На гэтым аб’екце створаны і ландшафтны парк, прызначаны для навукова-асветніцкай работы. Яго можна назваць не проста паркам, а класным пакоем на прыродзе.

Дворык з сярэднявечча

— Адной з асноўных мэт адкрыцця комплексу з’яўляецца прапаганда здаровага ладу жыцця сярод насельніцтва нашай краіны і замежных турыстаў. У людзей, якія цікавяцца гісторыяй, парк асацыіруецца з кляштарамі сярэднявечча. Яны, як правіла, мелі ўнутраныя дворыкі прамавугольнай формы, дзе манахі вырошчвалі лекавыя расліны, што не сустракаюцца ў прыродзе. А ў тыя часы лячыліся толькі натуральнай сыравінай, якую дарылі лясы, лугі, палі. Гэтыя дворыкі былі невялікімі, прамалінейнай планіроўкі, з рознымі цікавымі элементамі. Па такім прынцыпе і спланаваны Аптэкарскі сад: на цэнтральную алею яго як бы нанізаны розныя формы, кветкавая кампазіцыя з лагатыпам “БелАсептыкі”, вадаём з фантанам. Замыкае цэнтральную вось лабірынт, вакол якога створаны тэматычныя зялёныя пакоі: аптэкарскі агарод, ледавіковы перыяд, гаючая кладоўка, царства Марфея, або соннае царства. У кожным з гэтых імправізаваных жывых пакояў можна пасядзець, падыхаць водарам раслін, якія добра ўплываюць на работу сэрца або на нервовую сістэму. Акрамя таго, у гэтым райскім кутку адна з кампазіцый паўтарае геалогію Нарачанскага краю, з яго сажалкамі, пагоркамі, лясамі, азёрамі.

А ў фітагасцінай турыстам прапаноўваюць прадэгуставаць духмяныя чайныя кампазіцыі, а таксама — прыдумаць свой рэцэпт гарбаты з дапамогай вопытнага траўніка.

Дадам, што такіх комплексаў яшчэ не было ў Беларусі. У першапраходца — кампаніі “БелАсептыка” — шмат задум па ўдасканаленні аб’екта, прадастаўленні новых паслуг. Але выдаваць сакрэты не варта, каб не сурочыць.



Па даследаваннях вучоных за год з улікам зімоўкі пчаліная сям'я з'ядае да 100 кг мёду. Лішкі пчаляр адкачвае і пакідае сабе. Такі мёд называецца таварным. Яго колькасць залежыць ад многіх абставін: наяўнасці кармавой базы, сілы пчаласем'яў, працэнта замены мёду на цукар, патрэбнага для зімоўкі пчол.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Адкачванне мёду

Пчолкі складваюць мёд у соты, адтуль жа іх павінен забраць пчаляр. Каб акуратна дабыць мёд і не парушыць соты, ён праводзіць адкачванне мёду з дапамогай медагонкі. Соты ставяцца ў касеты прылады, дзе яны пракручваюцца. Дзякуючы цэнтрабежнай сіле, мёд на вялікай хуткасці вылятае з сотаў на сценкі медагонкі.

Першай аперацыяй адкачвання мёду з'яўляецца выманне сотаў з вулля. Яна праводзіцца ў бязношкавы перыяд, калі пчолы амаль не нясуць нектар у вулей. Бо калі той трапляе ў мёд, то пры далейшым захоўванні ён можа сапсавацца — расслаіцца альбо закіснуць. Можна праводзіць адбор сотаў і пры медазборы, але ў такім выпадку з вулля бяруць цалкам запячатаныя рамкі.



Раніца — найлепшы час для адбору рамак. За ноч пчолкі выкачалі з ужо прынесенага мёду значную колькасць вільгаці, а свежы ў вулей яшчэ не трапіў.

Для захоўвання мёду ад умоў мікраклімату вулля пчолы пакрываюць яго тонкім слоем воску — васковай накрыўкай. Пчаляру неабходна зняць з рамкі гэты слой воску, то бок распячатаць соты. Для гэтага выкарыстоўваюцца розныя прыстасаванні: нажы, відэльцы, камбайны, станкі для распячатвання. Выбар прыстасавання залежыць ад майстэрства пчаляра і колькасці мёду. Пры вялікай яго наяўнасці прымяняюць высокапрадуктыўныя станкі, пры малой — нажы альбо спецыяльныя відэльцы.

Распячатаныя соты ставяць у касету медагонкі. Пажадана, каб яна была выраблена з нержавеючай сталі. Дзюралевую (сплаў алюмінію з волавам) медагонку можна выкарыстоўваць толькі пры ўмове кароткачасовага захоўвання ў ёй мёду, а ацынкаваную наогул ужываць нельга. Цынк уступае з мёдам у хімічную рэакцыю, і той атручваецца. Медагонкі бываюць ручныя і электрычныя. Апошнія значна аблягчаюць і павышаюць прадуктыўнасць працы пчаляра, і ў іх не ламаюцца соты.

Дадаткова для адкачвання мёду спатрэбіцца стол для распячатвання сотаў, фільтр для працэджвання, нож, відэлец, тара для мёду (найлепш шкляная ці з нержавеючай сталі). Таксама пажадана мець



спецыяльнае памяшканне для адкачвання мёду. У ім ставяць стацыянарную медагонку ды іншае абсталяванне. Асобнае памяшканне з цёплай падлогай дае магчымасць пастаянна падтрымліваць высокую тэмпературу паветра (прыкладна 30°С), бо, як вядома, падагрэты мёд лёгка адкачваецца. Аднак беларускія бортнікі звычайна качаюць мёд не ў асобным памяшканні ці цэху, а непасрэдна на качоўцы.

Васіль КАВАЛЕЦ, старшыня Салігорскага міжраённага аб'яднання "Бортнік"

Мядовы век ВКЛ

Са старажытнасці бортніцтва паступова пачало развівацца і прымаць рысы развітага промыслу, а пасля яно перарасло ў галіну гаспадаркі на дзяржаўным (вялікакняжацкім) узроўні.

Ужо ў IX-XII стагоддзях воск і мёд з нашых земляў траплялі ў краіны Заходняй Еўропы і Міжземнамор'я. У гэты перыяд разгарнулася ўпарадкаванне бортнай справы: у "Рускай праўдзе" з'явіліся артыкулы, што рэгулявалі бортную дзейнасць, а па сутнасці з'яўляліся пісаным законам звычаёвай практыкі сярод насельніцтва.

Мядовы век бортніцтва прыйшоўся на XIV-XVI стагоддзі, часы існавання Вялікага Княства Літоўскага, калі ўсталяваўся попыт на воск і мёд сярод розных краін Еўропы. У тую пару яны складалі асноўную частку вывозімых з тэрыторыі ВКЛ тавараў. Прыбытковасць іх здабычы была ў 7-10 разоў большая ў параўнанні з вывазам лесу.


Так, у 1507-1508 гадах праз 5 асноўных мытных камор было вывезена 66,1 тысячы тон мёду ў сотах (для параўнання, у 2014 годзе з Беларусі вывезлі толькі 23 тоны гэтага прадукту). Менавіта ў мядовы век падарожнікі заўважылі, што па тэрыторыі ВКЛ бягуць звычайныя і мядовыя рэкі, бо бортніцтва ўзнялося на новы ўзровень і ператварылася ў незалежную галіну вялікай гаспадаркі. Гэта лёгка пацвярджаецца колькасцю борцей (у тым ліку калод): па падліках украінскага навукоўца Міколы Вітвіцкага, іх колькасць перавышала 1,5 мільёна заселеных борцей і яшчэ ў 2-3 разы больш незаселеных, або падрыхтаваных. Гэты маштаб проста ўражвае ў параўнанні з сённяшнімі падлічанымі раямі ў колькасці да 200 тысяч.

У гэты ж час сталі з'яўляцца паселішчы, якія спецыялізаваліся на здабычы мёду. Звесткі пра іх захаваліся і сёння: у Беларусі вядома каля 300 вёсак з бортнай тэрміналогіяй (Бор, Ліпаўка, Доўжані, Калода, Борці, Востраў). Бортніцтва ахапіла і вялікія гарады: Вільню, Горадню, Віцебск, Мінск. Тут пачалі адкрывацца найбуйнейшыя арганізацыі — бортныя брацтвы або цэхі з усімі атрыбутамі (статутам, сцягам, прысягай, абавязкамі, правіламі). Яны выконвалі ролю вялікай бортнай карпарацыі і мелі важнае значэнне як для горада, так і для ўсёй краіны. Брацтвы займаліся вытворчасцю воску, продажам мёду і напояў з яго, дабрачыннасцю.

Паступовае развіццё бортніцтва справакавала з'яўленне аднаго з самых дасканалых на той час у Еўропе пісанага заканадаўства. У Трэцім Статуце ВКЛ для бортніцтва было прадугледжана 7 артыкулаў (з 488 у агульнай колькасці). Акрамя таго на тэрыторыі ВКЛ дзейнічала строгая сістэма звычаёвага права, якая рэгулявала адносіны сярод бортнікаў.

Сфарміравалася спецыфічная тэрміналогія, якая ўпарадкоўвала дзейнасць у гэтай галіне. Так, слова "бор" сёння ўспрымаецца як сасновы лес, але раней яно мела значэнне "лес з 60 борцямі" і адначасова падатковай адзінкі. А "востраў" — гэта кавалак лесу, дзе размяшчаліся борці і калоды, якія належалі канкрэтнаму бортніку.


Іван ОСІПАЎ



